2. Выступления на собрании композиторов и музыковедов г. Москвы // Сов. музыка. – 1948. – № 1. – С. 63–102.
3. Лукас, Д. Рашуча выкараняць праявы фармалізма у музыцы / Д. Лукас // Літаратура і мастацтва. – 6 сак. – 1948.
4. Об опере В. Мурадели "Великая дружба" : Постановление ЦК ВКП(б) // Правда. – 1948. – 11 февр. – С. 3–6.
5. Протокол № 3 заседания Правления Союза советских композиторов от 23 февраля 1949 г. – БГАМЛИ. – Фонд 119. – Воп. 1. – Спр. 18. – Лл. 6–7.
6. Справка о работе Союза советских композиторов БССР с 01.01.1947 г. по 15.05.1948 г. – БГАМЛИ. – Фонд 119. – Воп. 1. – Спр. 16. – Л. 9.
7. Хренников, Т. За творчество, достойное советского народа / Т. Хренников // Сов. музыка. – 1948. – № 1. – С. 54–63.

## МУЗЫЧНАЯ ІНТАНАЦЫЯ КАМПАЗІТАРА (ДА 105-ГОДЗЯ НАРАДЖЭННЯ ПРАФЕСАРА, НАРОДНАГА АРТЫСТА БССР А. В. БАГАТЫРОВА)

Т. В. Сярнова, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
В. А.Чарняк, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (Рэспубліка Беларусь)

*Анатацыя.* Артыкул прысвечаны харавой музыцы А. В. Багатырова: харавым апрацоўкам народных песень і арыгінальным харавым кампазіцыям. Аналізуецца тэматыка, жанры і разнастайныя прыёмы харавога пісьма кампазітара.

*Annotation.* The article is focused on the choral music of A. V. Bogatyrev: choral arrangements of folk songs and original choral compositions. The subject, genres and various techniques of choral writing of the composer are analyzed.

*Ключавыя словы:* народная песня; харавая апрацоўка; шматжанравасць; арыгінальныя харавыя кампазіцыі; рысы харавога стылю.

*Key words*: folk song; choral arrangement; multi-genre; original choral compositions; peculiarities of choral style.

Анатоля Васільевіча Багатырова называюць патрыярхам айчыннай музычнай культуры і для такога «звання» ёсць усе падставы, і ў першую чаргу, калі паглядзець на вялікі спіс яго твораў. У Ім – оперы «У пушчах Палесся» па аповесці Я. Коласа «Дрыгва», «Надзея Дурава», кантаты паэма «Сказка о Медведихе» (сл. А. С. Пушкіна), «Ленинградцы» (сл. Д. Джабаева), «Беларускім партызанам» (сл. Я. Купалы), «Беларускія песні» і інш., араторыя «Бітва за Беларусь», сімфоніі, канцэрты для інструментаў з аркестрам, камерныя ансамблі, вакальная і харавая музыка, музыка да спектакляў і кінафільмаў...

Творчае аблічча А. Багатырова скпадалася пад спрыяльным уплывам прафесара Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі В. А. Запатарова, які цаніў дар свайго студэнта і ўсебакова яго развіваў. Адсюль і разнастайнасць жанравай палітры і сродкаў музычнай выразнасці. У кожным яго складанні, у кожным нотным радку, здаецца, прысутнічае сам кампазітар, энергічны, імпульсіўны, які востра рэагуе на кожную жыццёвую з'яву, у той жа час дзіўна сабраны, думаючы вельмі выразнымі катэгорыямі, глыбока чалавечны, інтэлігентны і добразычлівы.

Анатолем Васільевічам напісана значная колькасць твораў харавой музыкі, у тым ліку звыш сарака харавых апрацовак беларускіх народных песень, звыш трыццаці арыгінальных хораў. Усе творы даступныя, зразумелыя, хвалююць кожнае пакаленне слухачоў. І гэта не выпадкова, бо А. Багатыроў як харавы кампазітар вызначаецца тонкім адчуваннем беларускай паэзіі, уласна паэтычнага слова, што надзвычай арганічна звязвае яго музыку з напеўнасцю народнай паэтыкі.

Паэты, да творчасці якіх звяртаецца А. Багатыроў, – Я. Купала, Я. Колас, М. Танк, Э. Агняцвет, А. Астрэйка, М. Лужанін, – блізкія кампазітару па светаўспрыманню, адчуванню прыгажосці беларускага краю, яго людзей, прыроды. Часткова гэта адлюстроўваецца ў нястомнай цікавасці да паэтычнага і музычнага фальклору, што вызначыла адзін з яскравых бакоў яго творчага таленту. Таму творы кампазітара радуюць разнастайнасцю тэм, у якіх паказваюцца шчаслівая праца («Калгасная вясковая», «Вішанька», «Успаміны»), маляўнічасць родных мясцін («Люблю наш край»), гераізм народа («Песня пра Заслонава», «Люд наш беларускі»), вечная тэма кахання («Ты, дубочак зялёненькі», «Каліна-маліна», «Што то за хлопец, што за дзяўчына», «Зорка Венера»), а таксама гумар і сатыра («Беларуская застольная»).

Харавыя апрацоўкі А. Багатырова – гэта непаўторныя, выразныя, запамінальныя карціны народнага жыцця ва ўсёй яго разнастайнасці. Адсюль і шматжанравасць харавых апрацовак, якая ўласціва беларускаму музычнаму фальклору. Гэта і вальс («Люблю наш край»), і балада («Што та за хлопец»), і раманс («Зорка Венера»), а таксама вытрыманыя ў фальклорных матывах хоры вясельныя («Лужком ды далінаю»), сямейна-побытавыя («Салавейка, пташачка маленька»), рэкруцкія («Сівы галубочак», «Цёмная ночка»). Ствараючы харавыя апрацоўкі, А. Багатыроў не ўскладняе мелодыю-першакрыніцу, а з вялікім майстэрствам выкарыстоўвае яе своеасаблівую фактуру, каларытную гармонію, не парушаючы музычнага зместу і сутнасці арыгінала. Сувязь з беларускім фальклорам, такая выразная ў харавых апрацоўках кампазітара, адлюстроўваецца ў сферы вобразнасці – у няхітрай чысціні пачуццяў, шчырасці і эмацыянальнасці выказвання. Яны быццам натхняюць аўтара ўражаннямі дзяцінства, юнацтва. Праз музыку кампазітар дзеліцца ўсім гэтым са слухачамі. Харавым апрацоўкам уласцівыя такія якасці, як меладычная вынаходлівасць, абвостранае пачуццё гарманічнага і тэмбравага каларыту.

Канцэнтраваная выразнасць тэматызму інтанавання ў А. Багатырова заснавана на дакладным, ашчадным адборы з усяго фальклорнага быцця найбольш істотнага, таго, што блізкае душы мастака. Гэта сведчыць пра глыбокае разуменне сутнасці беларускага фальклору, веданне яго кампазітарам. Надзвычай багатая і шырокая вобразна-эмацыянальная палітра харавых апрацовак А. Багатырова. Тут і драматычная ўсхваляванасць – «Успаміны», «Цёмная ночка», «Гыля, гыля, мае шэры гусі», і лірычныя пачуцці – «Ты, дубочак зялёненькі», «Зорка Венера», і каларыстычная выразнасць народна-бытавых карцін «Калгасная вясковая», «Чарачка мая».

Адзначым найбольш характэрныя рысы харавога пісьма апрацовак. Да іх ліку трэба аднесці, у першую чаргу, страфічную кампазіцыю, прынцып запеву і прыпеву. Так, «Вішаньку» пачынаюць альты, пасля першай фразы далучаецца з унісону сапрана і гэтак далей, «Лужком ды далінаю» запяваюць жаночыя галасы, затым тэма гучыць у тэнара, а сапрана і альт – у падгалосках, пасля чаго мелодыю, якая заснавана на фальклорных традыцыях і метрарытмічнай пераменнасці, праводзіць бас.

Другой важнай рысай з'яўляецца выкарыстанне (пераважна фрагментарнае) прыёмаў поліфанічнай тэхнікі, што актывізуе музычнае развіццё. Гэта і падгалосачная (гетэрафанія), і імітацыйная поліфанія (кантата «Юбілейная»), якая ў большасці хораў кампазітара выступае як сродак стварэння распеўнага гучання апавядальнага характару. Адсюль нараджаецца пявучасць у фактуры твораў, калі галасы неўпрыкмет пераходзяць з аднаго рэгістра ў другі. Характэрна, што вядучы голас у такой раскладцы захоўваецца. Гэта звычайна бас, які ўшчыльняе фактуру, надае ёй важкасць і глыбіню. Нярэдка А. Багатыроў выкладае тэмы тэрцыямі, што таксама дынамізуе развіццё музыкі, гучанне. Адначасова ўзнікае і эфект зліцця лінеарнасці і вертыкалі, дзякуючы чаму тканіна твора нібы падзяляецца на некалькі пластоў: поліфанічны пласт (з пераходам голасу з аднаго рэгістра ў другі), гетэрафонны і трэці – педаль, якая, выконваючы «акордава-гарманічную» функцыю, расквечвае багатую фактуру.

Поліфанічны спосаб развіцця сустракаецца ў самых разнастайных жанрах харавых апрацовак, і мастацкія функцыі поліфаніі таксама разнастайныя. Напрыклад, у сямейнай песні «Салавейка, пташачка маленька» поліфанія ўжываецца як эмацыянальна-выразны сродак, у рэкруцкай «Сівы галубочак» яна з'яўляецца прыёмам унутрымеладычнага кантрасту, у вясельнай «Дбай, матуля, дбай» поліфанічная структура садзейнічае раскрыццю драматычнага зместу песні.

Яшчэ адной характэрнай рысай, уласцівай харавым апрацоўкам А. Багатырова, з'яўляецца вялікая ўвага да меладычнай асновы. Кампазітар моцна падкрэслівае сваю, асабістую трактоўку народных

мелодый, разглядае іх як неад'емную частку ўласнага інтанацыйнага фонду. Ён ашчадна ставіцца да першакрыніцы, выдзяляе ў яе меладычнай лініі найбольш характэрныя інтанацыі і звароты. Пры гэтым вядучай тэндэнцыяй з'яўляецца апора на шырокую мелодыку – песеннасць. Адсюль тая асаблівая, уласцівая жанру песні налеўнасць, шырыня дыхания, ллыннасць разгортвання. Адным са сродкаў дасягнення насычанага гучання выступае, у прыватнасці, тэрцавае выкладанне меладычнага рэльефу, рухомая, багатая нюансамі, кантрастнымі супастаўленнямі дынаміка. Гэтая песеннасць прасяквае ўсе галасы харавой партытуры, надае апрацоўкам непаўторныя рысы.

У цэлым харавая фактура апрацовак Анатоля Багатырова, дзякуючы мяккаму гучанню тэрцый, квінт, унісонаў, пявучасці галасоў, мае кансанантны характар, вызначаецца багаццем фарбаў. Пастэльнае гучанне перадае лірычны настрой народных песень.

У рабоце з паэтычным тэкстам А. Багатыроў прытрымліваецца ў асноўным страфічнай, куплетнай формы, узбагачанай парыяцыйным метадам развіцця. Адсюль і структурная акругленасць тэм, дзякуючы чаму форма ў цэлым набывае рысы завершанасці, пазбаўленай надуманасці і штучнасці. Своеасаблівая рыса кампазіцыйнага вырашэння харавых апрацовак кампазітара – гэта прынцып хвалевай дынамікі, калі развіццё ад экспазіцыі да кульмінацыі набывае характар няўхільнага руху, у аснове якога ляжыць мяккае, кантрастнае супастаўленне музычнага матэрыялу. У апрацоўцы «Каліна-маліна» якраз і назіраецца адзін з найбольш яскравых прыкладаў такога прынцыпу развіцця. Тут гетэрафанія першага раздзелу з характэрнай вязкасцю фактуры змяняецца ў другім акордава-гарманічнай фактурай з дыскрэтным рытмічным малюнкам. У далейшым гэты прыём паглыбляецца і развіваецца.

Падобныя метады развіцця сустракаюцца і ў іншых харавых апрацоўках. Агульная дынамічная скіраванасць формы адлюстравана ў няўхільным руху да кульмінацыі ў канцы твора. Яна звязана з выкарыстаннем такіх прыёмаў, як туці, фортэ, пашырэннем дыяпазону галасоў, які ахоплівае крайнія кропкі рэгістраў, іх дубліроўкай, паслядоўным насычэннем і ўшчыльненнем фактуры новымі інтанацыямі. Дзякуючы гэтаму ўзнікае тая эмацыянальная выразнасць, якая адлюстроўвае духоўны свет кампазітара.

Вялікую цікавасць уяўляе трактоўка харавой партытуры, якая выклікае асацыяцыі, напрыклад, рамансавага выкладання («Зорка Венера», «Люблю наш край»), дзе кампазітар часам стасуе функцыянальную дыферэнцыяцыю харавой партытуры, г. зн. падзяляе хор на саліста і ўласна хор, які ці акампануе салісту, з'яўляючыся непасрэдным удзельнікам дзеяння, ці выступае як каментатар («Ты, дубочак зялёненькі»). Усё гэта надае творам жыццёвасць, выразнасць і экспрэсіўнасць музычнага выказвання. Галасы хору нібы дыхаюць, рухаюцца, набываючы паўнакроўнае гучанне.

Апрацоўкі А. Багатырова адлюстроўваюць усе рысы музычнага стылю кампазітара, яго мастакоўскае светабачанне і мысленне. Пастаянная цікавасць да фальклору назіраецца не толькі ў апрацоўках, але і ва ўжыванні яго ў арыгінальных хорах. Таму фальклор, хоць ён і з'яўляецца адной з найбольш важных крыніц творчасці А. Багатырова, не ёсць адзіная інтанацыйная аснова яго харавых твораў.

Народны склад музычнай мовы кампазітара спалучаецца з глыбока індывідуальнай творчай своеасаблівасцю, якая праяўляецца ў шырокай гаме адценняў і настрояў, непаўторнасці музычна-выразных сродкаў. Арыгінальныя творы займаюць галоўнае месца ў харавой творчасці А. Багатырова, і асноўнай крыніцай натхнення для Анатоля Васільевіча застаецца паэтычная спадчына Я. Купалы і Я. Коласа. У арыгінальных харавых кампазіцыях асаблівасці стылю аўтара найбольш выразныя, бо А. Багатыроў заўсёды думае харавымі вобразамі. Хор для яго – не статычны, шматгалосы інструмент. Яго музыка – няўхільнае развіццё, адзначанае пастаяннай зменай тэмбравага каларыту.

Знаёмячыся з арыгінальнымі харавымі творамі А. Багатырова, мы нібы знаёмімся з гісторыяй Беларусі, яе народа. Разнастайнасць тэматыкі харавога мастацтва кампазітара вызначыла сюжэтную шматпланавасць музычных вобразаў. Гэта і нялёгкі шлях змагання за свабоду (хоры «Спіце, усе тыя», «Вам жыць і жыць»), мірная стваральная праца і шчаслівае жыццё («Наперад мой народ ідзе», «Шчаслівыя людзі»), любоў да роднага краю («Маладая Беларусь», «Слаўлю Беларусь»). У іх гаворыцца і пра цяжкую працу ў дарэвалюцыйны час, і аб працоўных перамогах сённяшняга дня, светлай будучыні. Шырока прадстаўлена і народна-бытавая лінія – хоры «Крыжачок», «Пад цёмным ляском», «Вяселле»; тэме абароны міру прысвечаны хор «Усе супраць вайны» (словы Э. Агняцвет). Значная частка хораў

звязана з тэмай роднай прыроды. Так, дзівоснай прыгажосцю напоўнены задуменны музычны пейзаж – харавы накцюрн «Праляцелі вятры» (словы У. Дубоўкі).

Такая шырокая тэматыка, шматжанравасць абумовілі выкарыстанне самых разнастайных прыёмаў харавога пісьма, што сведчыць пра сувязь харавога стылю А. Багатырова з народнай харавой спадчынай. Гэта назіраецца ў няхітрасці, пявучасці меладычнай лініі, насычанай распевамі і падгалоскамі, а таксама ў любімым прыёме кампазітара, калі ён уводзіць у пачатак твора саліруючыя галасы. Фальклорныя рысы выразна праступаюць і ў выкарыстанні кварта-квінтавых, унісонных гучанняў, пераменнага метра, рэльефнага рытмічнага малюнка. Уплыў народна-песеннай асновы прасочваецца і ў частым выкарыстанні пераліве́стасці аднайменных і паралельна-пераменных ладоў, у звароце да пабудовы простай куплетнай формы (у тым ліку і варыянтна-страфічнай).

Усё гэта арганічна спалучаецца з класічнымі традыцыямі ў творчасці кампазітара. У пэўнай ступені гэта тлумачыцца тым, што А. Багатыроў – вучань В. Залатарова, прадстаўніка школы М. Рымскага-Корсакава. Класічная аснова ў хорах А. Багатырова – уласна хор. Частае выкарыстанне фугіраванага развіцця, разгорнутыя секвенцыі надаюць гучанню шырыню і маштабнасць пры выказванні музычнай думкі. Для хораў кампазітара абавязковымі элементамі з'яўляюцца ўступ і заключэнне, дынамічнае і разам з тым паслядоўнае падвядзенне да кульмінацыі, рэзкі або павольны спад, сцвярджальны каданс. Усё гэта характэрна для драматургіі хору, якая атрымлівае разнастайнае музычна-мастацкае ўвасабленне ў малых формах і буйных харавых паэмах.

Хоры, напісаныя А. Багатыровым, разнастайныя па тэматыцы, жанрах, стылявых асаблівасцях, бо створаны яны былі на розных этапах мастакоўскага станаўлення кампазітара. У яго харавой творчасці можна дакладна вызначыць некалькі этапаў.

Першы (ранні) характарызуецца павялічанай цікавасцю да лірыка-драматычных вобразаў. Кампазітар звяртаецца да паэзіі М. Багдановіча, Я. Купалы, Т. Шаўчэнкі, П. Глебкі, яго прыцягваюць і жанравыя сцэнкі, бытавыя замалёўкі, лірычныя вобразы, звязаныя з тэмай кахання. Адным з ранніх твораў з'яўляецца хор з алегарычным тэкстам «Пад цёмным ляском» (словы П. Глебкі). У ім пануе настрой эмацыянальнага напружання: маладая дзяўчына, хвалюючыся, марыць пра будучыню. Пазбягаючы цытат, А. Багатыроў піша сапраўдны народны твор з характэрным колам вобразаў, тэмай, прыёмамі харавога пісьма, даступнай, немудрагелістай мелодыяй песеннага характару, унісонным актаўным гучаннем жаночых галасоў, тэрцавым выкладаннем музычнага матэрыялу, выкарыстаннем падгалоскаў, увядзеннем саліста.

Ужо ў ранніх харавых творах прасочваецца імкненне кампазітара «сінтэзаваць» хор як жанр, таму харавыя партыі трактуюцца неадназначна, галасы дыферэнцыруюцца на «вакальныя» і «інструментальныя». З аднаго боку, харавыя галасы – гэта суправаджэнне сола (звычайна сапрана), з другога – суправаджэнне ўласна хору.

У вывучэнні харавых партытур А. Багатырова цікавасць уяўляе вынаходлівасць, якая дасягаецца гамафонна-гарманічнымі сродкамі і распяваннем аднаго ці двух складоў, віртуознай разнастайнасцю рытмічных спалучэнняў гукавога малюнка.

60-ыя гады ў харавой творчасці А. Багатырова вызначаюцца ўзбагачэннем прыёмаў пісьма, пашырэннем кола вобразаў. Кампазітар звяртаецца да вершаў паэтаў Э. Агняцвет, А. Астрэйкі, М. Лужаніна, А. Бялевіча, М. Танка, Э. Валасевіча. У выбары тэкстаў выразна назіраецца грамадзянская пазіцыя кампазітара, барацьбіта за мір на зямлі. У яго хорах ажываюць вобразы роднай Беларусі, яе гісторыі, народа, прыроды.

Хор «Шумелі бярозы», які ўваскрашае вобразы гераічнага мінулага, напісаны ў жанры драматычнай балады. А. Багатыроў дэманструе вялікае майстэрства ў спалучэнні народнапесенных і класічных традыцый, шукае новыя шляхі пераўтварэння фальклору для больш поўнага раскрыцця зместу і музычна-паэтычных вобразаў. Так, паэтычны ўступ – гэта свайго роду эпіграф, інтанацыйна-сэнсавая фабула твора. Ва ўсхваляваным гучанні тэнараў на фоне квінтавага баса і ў рэчытатыўным правядзенні тэмы, якая перарываецца гучнымі воклічамі, адчуваюцца ўсхваляванасць і драматычны напал, што выклікае асацыяцыі з драматычнымі харавымі опернымі сцэнамі рускіх класікаў.

З іншага боку, метрычная пераменнасць, сола тэнара нібы змякчаюць агульную эмацыянальную прыўзнятасць. Змена акордавага стылю выкладання на гетэрафонны прыўносіць у пабудову хору фалькпорны элемент, арыгінальна пераасэнсаваны кампазітарам. Выкарыстанне дыятанічных фрыгійскага і дарыйскага ладоў падкрэслівае своеасаблівы каларыт гучання харавой партытуры, які адпавядае ладу мыслення А. Багатырова.

Для ўзмацнення драматургіі аўтар ужывае элементы фугіраванага развіцця, секвенцыйны падыход да кульмінацый. У гэтым назіраюцца рысы не толькі чыста класічнага выкладання музыкі, але і сімфанічнага метаду развіцця. Дзякуючы гэтай сімфанізацыі харавой партытуры дасягаецца той узровень эмацыянальнай выразнасці і змястоўнасці, які дазваляе лічыць хор «Шумелі бярозы» своеасаблівай паэмай, сімфанізаванай харавой баладай. Структура гэтага твора таксама нетрадыцыйная. Яна вызначаецца сувяззю з паэтычнай формай: а в а, в, а, (с с), кода. Па сутнасці, форма хору прадстаўлена разгорнутай страфічнай кампазіцыяй, якая бясконца абнаўляецца, дзе інтанацыйная пабудова няспынна вар'іруецца. Дзякуючы гэтаму кожны куплет – не проста паўтор, а новая, старонка музычнага апавядання. Анатоль Васільевіч па-майстэрску ўводзіць сола. Шматфункцыянальны і хор – яму даручана то фанічная функцыя, то роля каментатара, а часам і саліста.

З мінулым дзесяцігоддзем у кампазітара быў звязаны перыяд, які вызначаецца паглыбленнем і пашырэннем ужо набытых прыёмаў харавога пісьма. Характэрныя прыёмы, звароты, пошукі ў сферы інтанацыі, метра-рытму і фактуры набылі ўстойлівасць, утварылі своеасаблівы харавы стыль А. Багатырова. Хорам гэтага перыяду ўласцівыя рэльефнасць тэматызму, арганічнасць развіцця, адзінства формы, выразная, непаўторная і яскравая тэмбравая інструментоўка. Музычная мова харавых твораў глыбока самабытная і нацыянальная.

Важнай вехой на шляху развіцця харавой творчасці кампазітара з'явіліся партытуры, прысвечаныя 60-годдзю ўтварэння БССР. Вобразы герояў, якія аддалі жыццё за свабоду Радзімы, ажылі ў харавых паэмах «Спіце, усе тыя», «Маладая Беларусь», «Вам жыць і жыць», «Сцяна Крамлёўская». Гэтыя хоры адразу знайшлі выканаўцаў і шырокую аўдыторыю слухачоу.

Харавая паэма «Спіце, усе тыя» (словы Я. Купалы) прыцягвае цікавымі і своеасаблівымі прыёмамі харавога пісьма. Гарманічны каларыт уступных інтанацый, фраз, які выцякае з паралельнай і аднайменнай пераменнасці f-As, выконвае глыбокую, змястоўную функцыю, узмацняючы трагізм твора. Акордавы склад выкладання, строгая рытміка, форма, меладычная асновам – усё гэта з першых тактаў прыцягвае ўвагу слухача. Выкарыстанне divisi ў альта, тэнара ў тэрцыю, агагічныя адхіленні – гэта дадатковыя сродкі ўзмацнення экспрэсіі.

Цікавы ў гэтай сувязі і прыём дынамічнай скіраванасці ад шчыльнага шматгалосся на фортэ да унісоннага гучання. У развіцці харавога матэрыялу кампазітар ужывае элементы поліфаніі, але педаль размешчана як звычайна ў басоў. Тут яна выконвае функцыю акампанемента і ў той жа час бярэ на сябе асноўную насычанасць харавога гучання, што падобна аркестру з мноствам markdown рознатэмбравых інструментаў. Нельга не адзначыць і ўласцівыя хору каларыраванне dur – moll, адзначанае яшчэ ў пачатковых тактах, цікавае выкарыстанне баса ў якасці фундамента харавой гучнасці. Партытура прасякнута лейтматыўнай сістэмай. Тут і лейттэмбр, і лейтрытм, з высокім прафесіяналізмам выпісаныя для ўсіх галасоў. Яны перадаюць спецыфічны харавы каларыт гучання, суровы і строгі настрой паэмы-рэквіема.

Харавая музыка Анатоля Васільевіча Багатырова атрымала прызнанне далёка за межамі Беларусі. Яго хоры можна пачуць у выкананні самых розных мастацкіх калектываў. Ён з'яўляецца прыкладам сапраўднага мастака, які ўвабраў і акумуляваў у сваёй творчасці самыя розныя пласты (няхай гэта будзе беларускі фальклор або класічнае мастацтва, музыка XX стагоддзя або інтанацыі краін Усходу) і які знайшоў тую «залатую сярэдзіну», якая вызначыла яго кампазітарскую асобу – тое, што называецца яркай самабытнасцю і індывідуальнасцю А. В. Багатыроў стварыў новы сплаў, у якім вельмі арганічна зліліся нацыянальная характэрнасць, дзіўна беражлівыя адносіны кампазітара да беларускага фальклору і сапраўдная сучаснасць мастацкага светаадчування.